Доклады Национальной академии наук Беларуси
2015 сентябрь–октябрь Том 59 № 5

## *СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫЕ НАУКИ*

*Акадэмік У. В. ГНІЛАМЁДАЎ*

# ЛІТАРАТУРА І СУЧАСНАСЦЬ

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Беларусь*

Данное сообщении – это взгляд литературоведа и писателя на положение дел и тенденции развития современной белорусской литературы. Анализируются направления и особенности этого развития, связь с классическим наследием, расширение познавательно-тематической сферы и художественных поисков, соответствие литературного творчества современным задачам и требованиям.
*Ключевые слова*: человек, литература, современность, мировосприятие, менталитет, проблематика.

*V. V. GNILOMYODOV*

# LITERATURE AND TODAY'S CULTURE

*Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

This communication is a view of a specialist in study of literature and a writer on the state-of-the art and tendencies of development of modern Belarusian literature. Analysis is made of the directions and features of this development, the connection with classical literary heritage, the extension of cognitive and thematic scope and artistic searches, the adequacy of literary activity to modern tasks and demands.
*Keywords*: people, literature, modern, attitude, mentality, problematics.

Разважаць пра сучасную літаратуру – справа складаная і адказная. Не лёгка сучасніку ўбачыць і акрэсліць рэальныя абрысы сучаснасці, ацаніць мастацкія дасягненні, усвядоміць іх ролю і месца ў працэсе развіцця літаратуры. Тым больш што ў нашым жыцці многае змянілася самым нечаканым і карэнным чынам, у тым ліку і становішча пісьменнніка, умовы яго творчай дзейнасці, заангажаванасць грамадствам. Сёння часта чуюцца галасы накшталт таго, што «аўтар памёр», «літаратурны працэс абмялеў і знік», «літаратура скончылася». Ці так гэта? Вядома, усё цячэ, змяняецца, але патрэба ў літаратуры не адпала і яна не знікла, не парвала са сваімі асноватворнымі традыцыямі. Маральнай асаблівасцю нашай літаратуры было тое, што яна заўсёды судакраналася з народным лёсам, з усім тым, з чым гэты лёс быў звязаны. Яна страсна сцвярджала гуманістычную ідэю каштоўнасці чалавека як жывой, крэатыўнай істоты, адлюстроўвала нацыянальную ідэнтычнасць народа, матэрыяльны і духоўны ўклад жыцця, мову і традыцыі, характар і распаўсюджаныя тыпы асобы.

Літаратура – наша люстра і наша памяць. Яна стане яшчэ бліжэй і даражэй нам, калі мы пранікнем у яе сацыяльна-эстэтычную прыроду, зразумеем гістарычныя асаблівасці. Нягледзячы на тое, што «літаратурацэнтрызм» у многім стаў атрыбутам мінулага, літаратура была і застаецца летапісам жыцця і адначасова чалавеказнаўствам, незаменным сродкам пазнання чалавека ў яго сувязях з навакольным светам, з працэсам фарміравання, станаўлення нацыі. Беларуская літаратура ва ўсе часы імкнулася пранікнуць у субстанцыю народнага жыцця, выявіць

© Гниломедов В. В., 2015.

карэнні і асновы грамадскага, чалавечага быцця, даць вобраз часу. Літаратурная спадчына – гэта наша мастацкае і духоўнае багацце. А. Разанаў наступным чынам выказаўся пра літаратурную спадчыну: «Спадчына не ў мінулым, а з мінулага: яна – вектар, які паказвае дарогу, яна – аблічча ўчалавечанага часу» [1, с. 42]. Сказана правільна: літаратура – гэта «ўчалавечаны час».

За савецкім часам у літаратурным ужытку існавалі так званыя абоймы – кароткі пералік найбольш вядомых пісьменнікаў, паэтаў, драматургаў, якія часцей за ўсё згадваліся ў выступленнях крытыкаў і калялітаратурных размовах. У 2014 г. выйшла з друку заключная частка акадэмічнай «Гісторыі беларускай літаратуры ХХ стагоддзя» – том 4, кніга 3. У ёй ідзе размова пра шэраг (некалькі дзясяткаў) пісьменнікаў, многія з якіх прадуктыўна працуюць і сёння, але, трэба сказаць, што такіх велічыняў, як М. Танк, І. Шамякін, В. Быкаў, сярод іх, на жаль, няма. Зменшыўся маштаб пісьменніцкай асобы і, адпаведна, маштаб творчасці, хаця літаратура і не звужае сваёй тэматыкі, па-ранейшаму імкнецца трымаць у полі зроку важнейшыя праблемы жыцця, шукаць новыя, сучасныя падыходы да іх асэнсавання.

Што ёсць, тое ёсць. Творы сучасных беларускіх пісьменнікаў, такіх як В. Зуёнак, В. Казько, А. Вярцінскі, А. Федарэнка, А. Разанаў, Л. Левановіч, Ю. Станкевіч, М. Мятліцкі, У. Саламаха, А. Бадак, Б. Пятровіч, В. Шніп, Т. Сівец, Н. Касцючэнка, М. Пазнякоў і многіх іншых, дапамагаюць літаратуры ў пошуках праўдзівага, адэкватнага слова, садзейнічаюць у выкараненні застарэлага грэху сервільнасці. У лепшых творах абмяркоўваюцца пытанні прызначэння чалавека, яго ўзаемадачыненняў з прыродай, грамадствам, зямлёй, космасам. Літаратура імкнецца зразумець, што аб'ядноўвае ў адно цэлае, скажам, кветку пралескі, бляск зоркі і лёс чалавека.

Наш час – час усталявання капіталістычных адносін у грамадстве – прывучае чалавека да жыццёвай, дзелавой актыўнасці, намагаецца загартаваць яго ў пустыні індывідуальнай барацьбы за існаванне. У 1990-я гады перамагае ўстаноўка на асабістую рызыку і адказнасць, цэніцца дзелавітасць. У Беларусі марудна, але ідзе фарміраванне грамадзянскай супольнасці. Умацоўваецца вера людзей у самарух самога жыцця, у тое, што ўсё ўрэшце ідзе да лепшага, што людзі разумнеюць, набіраюцца досведу, што іх згуртоўваюць агульначалавечыя каштоўнасці.

Трэба мець на ўвазе таксама, што сёння размываюцца межы паміж сур'ёзнай літаратурай, вытрыманай у класічных традыцыях, і літаратурай масавай, разлічанай на не надта патрабавальнага чытача. Адна і другая карыстаюцца пэўным попытам.

Пісьменнікі ўсімі даступнымі ім сродкамі, атрыманым творчым вынікам, працягваюць уплываць на сучасніка, фарміраваць яго светапогляд, этычныя ўяўленні, нацыянальную свядомасць, узбагачаць духоўнасць. Пашыраецца пазнавальная сфера пісьменніцкага даследавання, павялічваецца кола тэм. Літаратура заклапочана спасціжэннем гістарычнага досведу чалавека, духоўнай і сацыяльнай прыроды, зацікаўлена яго рэальным становішчам і перспектывамі. Доўжыцца тэндэнцыя, звязаная з развіццём асабовага, аўтарскага пачатку ў пісьменніцкай творчасці, што відаць, напрыклад, у такога вопытнага мастака, як А. Савіцкі. Герой яго рамана «Пісьмо ў рай» (2003) – пісьменнік Алесь Смоліч. Ён ужо немалады, мае немалы жыццёвы досвед, на жаль, большай часткай драматычны і трагічны. Прайшоў вайну (пачынаючы з партызанкі), зведаў голад, бачыў смерць, пакуты, быў паранены. Прайшоў час, «перабудова», «галоснасць» абвастрылі ў ім пачуццё справядлівасці, якое вяртае яго да нявысветленага лёсу роднага бацькі, што трапіў пад рэпрэсіі і загінуў у Гулагу. Аўтар звяртаецца да фактаў уласнай біяграфіі, сямейнай памяці, да таго, пра што да гэтага даводзілася маўчаць. У яго героі А. Смолічы якраз выразна прасочваецца абуджэнне і развіццё пачуцця асобы. Ён, ужо на новым узроўні свядомасці, перажывае маральны ўздым, становіцца сапраўднай асобай, чалавекам-грамадзянінам, паслядоўным і настойлівым, актыўным у пошуках праўды і справядлівасці. Маральны пафас твора ўзмацняе цікавасць да яго з боку чытача.

Нездарма літаратуру, як мы ўжо казалі, называюць чалавеказнаўствам. Сёння яна ўважлівей, чым учора, узіраецца ў чалавечае жыццё, сферу грамадскай свядомасці, індывідуальныя лёсы і характары. Назіраецца агульны нахіл да шчырасці, верагоднасці, праўдзівасці і дакументалізму. Дакументальны пачатак у розных формах яго эстэтычнага ўвасаблення атрымаў вельмі выразнае гучанне ў нашай літаратуры і мастацтве. Павялічылася ўдзельная вага факта ў сучаснай прозе, у пошуках пісьменнікаў, актывізуецца мемуарная плынь. Мастацкая форма даволі часта набліжаецца да публіцыстыкі, эсэ, рэпартажу, а часам нават да навуковага даследавання.

Разнастайны фактычны матэрыял праходзіць праз прызму прафесійнай пісьменніцкай свядомасці, уважліва аналізуецца, адбіраецца, кампазіцыйна арганізуецца, усебакова асэнсоўваецца. Пошук фактаў становіцца пошукам новых дакументальных і мастацка-дакументальных выяўленчых сродкаў, новых жанраў. Усё гэта абумоўлівае поспехі дакументальнага слова.

Дакументальныя жанры багатыя на разнастайныя адценні. Сюды ўваходзяць дзённікавыя, публіцыстычныя, нарысавыя кнігі, гісторыка-мемуарныя творы, навукова-даследчая літаратура.

Сёння літаратура намаганнямі многіх пакаленняў пісьменнікаў паглыбляе памяць і ўяўленне пра вайну, паказваючы яе ва ўсёй праўдзівасці перажытага і выпакутаванага народам, пазбягаючы іранічных інтанацый, фальшы.

Важнае пытанне сучаснага літаратурнага працэсу – прадмет і метады мастацкага пазнання і адлюстравання жыцця. І. Бродскі ў сваёй Нобелеўскай лекцыі казаў пра «тры метады пазнання: аналітычны, інтуітыўны і метад, які́м карысталіся біблейскія прарокі, – праз адкравенне. Адрозненне паэзіі ад іншых форм літаратуры ў тым, што яна карыстаецца адразу ўсімі трыма (схіляючыся пераважна да другога і трэцяга)...» [2, с. 6]. Гэта сказана пра паэзію, аднак пералічаныя метады пазнання прыдатныя, думаецца, і да ўсіх родаў і жанраў мастацкай літаратуры.

Пазнанне чалавека было і застаецца галоўным яе прадметам. Больш за тое, сёння цікавасць да чалавечых глыбінь асобы выходзіць у літаратуры, як і ва ўсім мастацтве, на першы план. Не заўсёды ёсць патрэба рэзка размяжоўваць літаратуру па тэмах і звязваць з гэтым мастацкія крытэрыі літаратурнай творчасці. Не варта, скажам, «народны характар» звужаць пераважна да паняцця «характару селяніна», бо ў складванні гэтага характару прымала ўдзел не толькі сялянства, але ўвесь народ, усё грамадства.

Некаторыя сцвярджаюць, што літаратура «сказала пра чалавека ўсё, што яна магла пра чалавека сказаць. Літаратура незлічона абгаварыла яго цела і фізічныя патрэбы, яна наўсцяж абмеркавала ўсе трымценні душы і памкненні духа і нават вывернула вонкі вантробы чалавека, каб вынюхаць самы гнюсны смурод з яго фізіялагічных нетраў. Усё! Нідзе нічога нязведанага ад чалавека не засталося, каб можна было спадзявацца на эўрыстычны працяг. У гэтым сэнсе літаратура скончылася з той самай прычыны, што і эпоха геаграфічных адкрыццяў» [3, с. 158].

Не! Літаратура не скончылася, геаграфічныя адкрыцці не скончыліся, і пазнанне чалавека не скончылася, працягваецца. Насуперак падобным выказванням сёння ўсё часцей і настойлівей гучыць думка адкрывальнікаў генома чалавека пра тое, што эвалюцыя чалавека не спынілася і што чалавек не выкарыстоўвае ўсе свае магчымасці. Напрыклад, Алімпійскія гульні паказваюць яшчэ непазнаныя і неасэнсаваныя магчымасці нашага фізічнага развіцця, якія па часе павялічваюцца. Павялічваецца не толькі фізічны патэнцыял, але павялічваюцца і здольнасці нашага мозга.

«Столькі праводзілася эксперыментаў, і, здаецца, чалавек столькі ведае не толькі пра свет прыроды, але і пра свет свайго цела. Аднак засталіся рэчы, якімі яшчэ можна здзівіць нават спакушанага знаўцу біялагічнай прыроды чалавека» [4, с. 6], – узрушана канстатуе журналістка С. Шыян.

Не стаіць на месцы, развіваецца, не толькі біялагічная прырода чалавека, але і яго сацыяльнае, грамадскае аблічча. Чалавек у большай ступені, чым раней, стаў цікавым для сябе, ён стаў заўважаць «другога», іншага, аказаўся здольным на ўчынак, асмельваецца думаць па-свойму – усё гэта ідэйныя вынікі XX стагоддзя. Літаратура наша назапасіла багаты мастацкі матэрыял, досвед пісьменнікаў значна пашырыўся. І чым болей здабыта крупіц мастацкіх адкрыццяў, тым настойлівей патрэба ў новым мастацкім сінтэзе, у смелым ахопе рэчаіснасці, ва ўменні за сціплым фактам убачыць патаемныя, запаветныя глыбіні быцця.

Справе павінна дапамагчы крытыка, якая сёння таксама шмат шукае, эксперыментуе. Крытыка вучыцца бачыць у мастацкім тэксце, як таго патрабаваў М. Бахцін, складаную сістэму сувязей, рухомае і зменлівае адзінства, якое можна раскладаць на састаўныя часткі, разнімаць і аналізаваць, тлумачыць, але да дна вычарпаць немагчыма, таму што яго сутнасць – шматзначнасць. Тэма твора ці аб'ект адлюстравання пачалі губляць каштоўнасную сілу. Увага крытыкі павярнулася да «краевугольных словаў», антыноміяў матываў, да паэтычнага сінтаксісу, постаці апавядальніка, індывідуальнасці інтанацыі, законаў рытму, узбагачэння жанравага канона. Кры-

тыка заклапочана перш за ўсё тым, каб устанавіць «код» твора – як камунікатыўнага акта, які становіцца ўсё складаней у XXI стагоддзі, ускрыць як мага болей сэнсавых слаёў яго полісемантычнага адзінства. Абазначаюцца апазіцыі ў структуры твора: высокае–нізкае, чорнае–белае, дзень–ноч, агонь–вада, вяршыня–глыбіня, добрае–дрэннае, свет–дом, жыццё–смерць. Падлічваецца, колькі разоў сустракаюцца ў творы прыметнікі сіні, зялёны, чырвоны, шэры – такім чынам устанаўліваецца каляровая гама. Складаецца пералік дзеясловаў, які фіксуе асноўныя сэнсы твора і акрэслівае кругагляд аўтарскага мыслення і г. д. Аднак падобная крытычная інтэрпрэтацыя не тычыцца пытання аб каштоўнасці твора. Частотны слоўнік ці бінарныя апазіцыі, тапонімы ці аксюмароны аднолькава адлюстроўваюць колькасную будову як моцных, так і слабых кніг, таму што застаюцца абыякавымі да эстэтычных абертонаў сэнсаў.

Пазнанне каштоўнасці твора – важнейшая задача крытыкі. Найсучаснейшыя тэорыі не могуць замяніць непасрэднага перажывання мастацкай каштоўнасці. Гэта духоўная энергія крытыкі, з якой ствараецца прастора і напружанне літаратурна-крытычнага тэксту, як раманіст, паэт ці драматург ствараюць свае творы з перажывання агульначалавечых каштоўнасцей. Ва ўстанаўленні каштоўнасці ўдзельнічаюць усе якасці асобы: сіла інтэлекту, жыццёвы вопыт, маральныя прынцыпы, эстэтычная чуласць, культурная памяць, інтуіцыя.

Вядома, што чалавецтва развіваецца ад роду да індывіда, але значэнне родавага ад гэтага не змяншаецца. Асоба бярэ ў спадчыну ад роду досвед, жыццёвыя прынцыпы, ідэалы. Гісторыя, гістарычны час належаць усім пакаленням, якія захоўваюць свае антрапалагічныя і этнавызначальныя рысы, радавод народа, нацыянальны культурны код. «Архаічная культура, – лічыць А. Геніс, – не ведае канфлікта бацькоў і дзяцей, таму што кожнае пакаленне атрымлівае ў спадчыну адказы на ўсе экзістэнцыяльныя пытанні. Усе ведаюць: сэнс жыцця ў тым, каб проста быць на сваім месцы ў сусвеце, удзельнічаючы ў касмічнай гульні жыцця і смерці... Усе сілы скіраваныя на тое, каб у супрацоўніцтве з прыродай забяспечыць уласнае ўзнаўленне» [5, с. 206]. Культура беларусаў, безумоўна, утрымлівае ў сабе архаічныя рысы, якія знайшлі адлюстраванне і ў літаратуры. Аднак час унёс сюды, у культуру і менталітэт беларусаў, істотныя змены.

XXI стагоддзе мала чым падобнае да XX. Змяніліся, сталі больш прагматычнымі адносіны паміж людзьмі, якія апынуліся ва ўмовах сацыяльнай адзіноты і вымушаны весці індывідуальнае змаганне за існаванне. Чалавек аднак павінен заставацца чалавекам, здольным на дабрату, чалавечнасць, пошукі адказу на пытанне пра сэнс свайго існавання. Літаратура выступае як захавальніца і стваральніца духоўных каштоўнасцей, якія выступаюць адначасова як крыніца чалавечых патрэб і як норма быцця. Параметры жыццёвых, духоўных каштоўнасцей літаратура мадэлюе на матэрыяле сямейнага, грамадскага, дзяржаўнага жыцця. Яна прасвечвае кожны атам гэтага матэрыялу, не прызнаючы забаронных зон. Сёння, калі шмат што істотна змянілася, гэтых зон, здаецца, і наогул няма. Не ўсё, на жаль, змянілася ў лепшы бок. У многім страцілі сілу рычагі маральнага рэгулявання. Філосафы і сацыёлагі гавораць пра «пераломную сітуацыю» ў маральнай сферы. Сталася так, што сёння ад чалавека ў першую чаргу патрабуецца запас ведаў, дзелавітасць, прабіўная сіла характару, а духоўныя, маральныя якасці адыходзяць на задні план.

Савецкая ідэалогія арыентавала грамадства на выхаванне безнацыянальнага homo sowetikus, але пацярпела на гэтым шляху паразу. На гэтым аднак выпрабаванні для беларушчыны не спыніліся. Выразна акрэсліліся абрысы сусветнага глабалізму. Людзі з болем задумваюцца над станам сучаснага свету, над узаемасувяззю вынікаў і прычын, складанасцю і шматмернасцю чалавечага вопыту. На «мяжы» часоў, сёння гэта асабліва адчуваецца, незвычайна востра паўстае пытанне аб захаванні і ўмацаванні духоўных і маральных каштоўнасцей чалавека – чалавечай годнасці, дабраты, сумленнасці, павагі... Сучаснасць ускладнілася ў самой сваёй жыццёвай сутнасці, чалавецтва апынулася перад праблемай захавання навакольнага асяроддзя, зберажэння гістарычнай памяці і ўсіх каштоўнасцей, створаных народамі. Тым не менш беларуская нацыянальная свядомасць, нацыянальны менталітэт прасякнуты жыццесцвярджальным пачаткам. Гісторыя навучыла беларусаў прыстасоўвацца да розных жыццёвых сітуацый. Жыццё паказала, што беларускі народ здольны адказаць на выклікі сучаснасці. «У нас, – лічыць адзін з лідараў партыі «БХД» А. Шэін, – яшчэ захоўваецца ўнікальная гістарычная магчымасць закласці правільны нацыянальны фундамент. Мы – маладая, не да канца сфарміраваная нацыя, у якой да

гэтага часу не аформлены нацыянальны тыпаж. Мы ўсё яшчэ спрачаемся, якой павінна быць нацыянальная сімволіка (чырвона-зялёная ці бела-чырвона-белая), якім павінен быць нацыянальны гімн («Мы – беларусы» ці «Магутны Божа»), як павінны называцца ў будучым мы самі (беларусы ці літвіны). А гэта значыць, што працэс фарміравання нацыі яшчэ працягваецца, на фарміраванне аблічча нашай краіны актыўна ўплываюць правільныя і памылковыя ідэі, прынцыпы, канцэпцыі» [6, с. 17].

Нацыянальная свядомасць, культура, мастацтва, літаратура, нягледзячы на не заўсёды спрыяльныя ўмовы, на сусветны наступ глабалізму, застаюцца запатрабаванымі і працягваюць развівацца. Беларусы як народ, нацыя, заўсёды шмат бралі ў іншых народаў, бралі веды, ідэі, словы, запазычвалі дасягненні цывілізацыі. У сваю чаргу, здабыткам іншых народаў і культур стала творчасць Сімяона Полацкага, Адама Міцкевіча, Элізы Ажэшкі, Станіслава Манюшкі...

Даўно ўжо набыў практычны характар працэс уваходжання Беларусі ў еўразійскую інтэграцыю. Гэта можна разглядаць як новую фазу росту этнасу. Сучасны беларус – гэта перш за ўсё «еўрапеец», чалавек, які адчувае сябе прадстаўніком еўрапейскай цывілізацыі, ведае гісторыю Еўропы і яе культуру, характарызуецца высокім інтэлектам і духоўнымі запатрабаваннямі.

Сёння беларусы, як нацыя палітычная, дзяржаваўтваральная, усё больш разлічваюць на свае ўласныя, унутраныя сілы, цярэбяць дарогу ў будучыню. Аднак нацыянальная свядомасць, яе стан і развіццё маюць патрэбу ў абароне і дапамозе. Гэта, магчыма, перш за ўсё тычыць пытання мовы, у тым ліку яе ўнутранага стану. Сёння беларуская мова павінна ўзбагачаць сваю лексіку, і не толькі за кошт новатвораў і запазычанняў, але і за кошт абласных дыялектаў, а таксама ўзнаўляць забытыя словы і выразы. «Ул. Караткевіч, – згадвае яго І. Штэйнер, – са шкадаваннем адзначаў, што сучасная беларуская мова і сёння запінаецца на паняццях старадаўняй метафізікі і таго, што складала навуку магіі, астралогіі, дэманалогіі і інш. Ён лічыў, што прыйшла пара беларускай мове згадаць многія старыя юрыдычныя, філасофскія, наогул кніжныя словы, зрабіць усё магчымае і немагчымае для ўвасаблення глыбокіх думак і ідэй...» [7, с. 51].

Сучасная літаратура – у руху, у спаборніцтве пісьменнікаў і твораў, у пошуках. Без сістэмы каштоўнасцей, без згуртоўваючых, інтэгруючых ідэй грамадства існаваць не можа. Тут і павінна сказаць сваё слова літаратура. Даць канкрэтны прагноз яе стану на заўтра, прадказаць тэматыку, тэндэнцыі і напрамкі немагчыма, але ясна адно: развіццё літаратуры не спыніцца, нават калі б нехта захацеў яго спыніць. Патрэба ў мастацка-эстэтычным пазнанні і творчасці такая ж неадольная, як само жыццё. Правільна, з уласцівай яму афарыстычнасцю, сказаў сучасны паэт Мікола Мятліцкі: «Без літаратуры няма нацыі, няма народа, няма дзяржавы...».

Сёння мы апынуліся ў новых гістарычных умовах XXI стагоддзя, і значэнне літаратуры ўзрастае, ніколькі не губляючы сваёй актуальнасці. Яна – наш нацыянальны пашпарт, па якім нас пазнаюць у свеце, яна мае адначасова нацыянальнае і агульначалавечае значэнне. Яна прасякнута вітальнаю сілаю, выступае на баку жыцця, чалавека, яго правоў і каштоўнасцей.

Практыка паказвае, што толькі тое застаецца ў гісторыі, у людской памяці, што атрымлівае пацверджанне ў літаратуры.

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. *Разанаў, А.* Сума магчымасцяў: зномы / А. Разанаў. – Мінск: Выдавецтва «І. П. Логвінаў», 2009. – 185 с.

2. *Бродский, И.* Нобелевская лекция / И. Бродский // Книжное обозрение. – 1988. – 10 июня. – С. 6.

3. *Акудовіч, В.* Архіпелаг Беларусь: кніга дыялогаў / В. Акудовіч. – Мінск: Выдавецтва «Галіяфы», 2010. – 188 с.

4. *Шыян, С.* Зазірнуць у нанамір і сутыкнуцца з двухаблічным Янусам / С. Шыян // Настаўн. газ. – 2014. – 25 кастр. – С. 6.

5. *Генис, А.* Вавилонская башня: искусство настоящего времени / А. Генис // Иностранная литература. – 1996. – № 9. – С. 189–223 с.

6. *Шеин, А.* Христианство и беларуская национальная идея / А. Шеин // Беларусь превыше всего!: о национальной беларуской идее. – Смоленск, 2011. – С. 5–42.

7. *Штэйнер, І.* Уводзіны ў невымоўнае: філасофія паэзіі Алеся Разанава / І. Штэйнер. – Мінск: «Выдавецкі дом «Звязда», 2013. – 349 с.



*Паступіла ў рэдакцыю 27.04.2015*